## Класная гадзіна “Зямля пад белымі крыламі”

**Мэта:**

-садзейнічаць фарміраванню патрыятычнасці і самасвядомасці вучняў.

**Задачы:**

- садзейнічаць развіццю пазнавальных і творчых здольнасцей вучняў да самастойных даследванняў;
- развіваць у вучняў цікавасць да пазнання гісторыка-культурнай спадчыны роднай краіны і яе сучасных дасягненняў;
- фарміраваць паважлівыя адносіны да сваёй Айчыны;
- выхоўваць пачуццё гонару і глыбокай павагі да нацыянальных традыцый, звычаяў, культуры.

**Абсталяванне**: карткі з заданнямі, прэзентацыя

## ХОД КЛАСНАЙ ГАДЗІНЫ

I. Уважліва паслухайце песню

Гучыць песня пра Беларусь (Андрэй Кунец, 1)

**Н**:. Якія пачуцці ўзніклі ў вас пасля праслухоўвання? Аб чым гэтая песня? Як вы думаеце, чаму ў пачатку нашага ўрока я прапанавала вам менавіта яе? Аб чым мы сёння будзем гаварыць?

- Паслухайце верш П.Броўкі і вызначце, у якіх радках заключаецца асноўная думка гэтага верша. Вызначце тэму нашага ўрока.

**Вучань:**

На карце вялікага вету
Яна, як зялены лісток,
Песня гарачага лета,
Крынічнай вады глыток.
Адвечная калыханка,
Душы запаветны куток,
Трапеча гарачым ранкам
На дрэве нястомны лісток.
А ў навальніцу б’ецца,
Небачна паміж лісця,
Як родная матчына сэрца,
Што мне даражэй жыцця.

**Н:** Якая прыгожая назва ў нашай краіны – БЕЛАРУСЬ! А яшчэ мы завём яе – РАДЗІМА. А яшчэ – БАЦЬКАЎШЧЫНА. РАДЗІМА– бо тут мы нарадзіліся, бо яна нам самая родная з усіх краін на цэлым свеце. БАЦЬКАЎШЧЫНА – бо яна дасталася нам ад бацькоў нашых. А ім ад іх бацькоў – нашых дзядоў.

**Нацыянальныя сімвалы Рэспублікі Беларусь**

Н: Рэспубліка Беларусь, як і ўсе краіны, мае сваю нацыянальную сімволіку: Дзяржаўны герб і Дзяржаўны сцяг, якія былі прыняты ў выніку ўсенароднага галасавання 14 мая 1995 года. Герб і сцяг лічыліся і лічацца ва ўсіх краінах вышэйшымі сімваламі народа. Яны сімвалізуюць для кожнага чалавека, для кожнага грамадзяніна Радзіму. Акрамя герба і сцяга кожная краіна мае яшчэ адзін сімвал – гэта Дзяржаўны гімн, які мы слухаем стоячы.

2 ліпеня 2013 года адбылася ганаровая цэрымонія адкрыцця плошчы Дзярдаўнага сцяга ў сталіцы нашай радзімы, у якой прыняў удзел Прэзідэнт РБ А.Лукашэнка.

А цяпер уважліва паглядзіце на Дзяржаўны герб і сцяг Беларусі. Што на іх акдлюстравана? Паспрабуйце адказаць на мае пытанні.

**Віктарына**
**« Дзяржаўны герб і сцяг Рэспублікі Беларусь»**

1. Калі быў зацверджаны герб Рэспублікі Беларусь? ***(14 мая 1995г.)***
2. Што сімвалізуе **чырвоны колер** на сцягу Рэспублікі Беларусь***?*** ***( сімвалізуе барацьбу, а таксама кроў пралітую ў барацьбе, барацьбу за справядлівасць, знак шчаслівага жыцця, брацтва)***
3. Што сімвалізуе **вянок** на гербе Рэспублікі Беларусь? ***(узнагарода пераможцу, перамога, новы ўраджай, працвятанне краіны, працалюбства)***
4. Што азначае **“Зямны шар”** на гербе Рэспублікі Беларусь***?(гэта знак таго,што Рэспубліка Беларусь успрымае ўсе народы Зямлі як раўнапраўных сяброў і партнёраў, гатова з імі дружыць і гандляваць, абменьвацца вырабам і ведамі)***
5. Аб чым гаворыць **зялёны колер** на сцяге Рэспублікі Беларусь***( колер гаёў і дуброў, палёў і балот, сімвал жыцця, вясновага прабуджэння прыроды пасля зімовага сну, сімвал дабра і міру, дабрабыту)***
6. Што азначае **лён на** гербе Рэспублікі Беларусь?(***працавітасць, знак дабра і дастатка)***
7. Што азначае **“Пяціканцовая зорка”** на гербе Рэспублікі Беларусь***?(сімвал чалавека і чалавецтва, знак мужнасці і высокіх памкненняў. У гэтай якасці чырвоная зорка выкарыстоўвалася ў часы існавання вялікай дзяржавы – Савецкага Саюза. Адной з яго рэспублік была Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка)***

8. Аб чым сведчыць **белы колер арнамента** на сцягу Рэспублікі Беларусь***?(колер свабоды, мудрасці, маральнай чысціні)***
9. Што азначае **канюшына** на гербе Рэспублікі Беларусь? ***(сімвал сувязі з жывёльным светам, сімвал працвітання і жыцця)***
10. Якія элементы змешчаны на беларускім арнаменце?

***(Адказваюць; геаметрычныя, а дакладна "ромбы")***

11. Чым адметны сцяг РБ ад сцягоў іншых краін?

***(Адказваюць; у адказах павінны прагучаць колеры сцяга, арнамент)***

**Мясціны Рэспублікі Беларусь**

**Наш родны край - прыгожы самы**

Вядома ўсім, што вельмі шмат
Куткоў на свеце дзіўных.
Але не менш, а болей, брат,
Іх на тваёй радзіме,
У нашым краі дарагім,
У Беларусі роднай.
Не памяняешся ні з кім
Яе красою годнай.

Для выканання наступнага задання прапаную вам падзяліцца на групы

Кожны чалавек павінен заўсёды ведаць памятныя мясціны таго месца, дзе ён нарадзіўся. І гэта заданне пад назвай **"Мой родны кут"** дапаможа нам выявіць, наколькі вы ведаеце мясціны роднага Свіслацкага краю і Беларусі**.**

**Н.:** На слайдах адлюстраваны славутыя мясціны нашай краіны і Свіслаччыны. Ваша задача: пад картачкамі напісаць назву мясціны. У вас ёсць час, пакуль будзе гучаць песня. Для вас спявае ансамбль Песняры

*(Удзельнікі адказваюць назвы мясцін, у гэты час на экране - слайды гэтых мясцін.)*

**Настаўнік:** А зараз я прапаную вам на нейкі час стаць мастакамі. Але маляваць вы будзеце не фарбамі, а словамі. Неабходна стварыць карціну аб нашай Радзіме. Кожнае слова неабходна растлумачыць.

Сінявокая ( или синеглазая) – у нас много красивых рек, озер.

В полях цветут синие васильки .

Зялёная – очень много лесов, лугов и полей.

Лепшая – потому что – это наша Родина.

Дружалюбная – белорусы – народ дружелюбный и гостеприимный.

Белая – белый – цвет добра и чистоты. Издавна белорусы любили одеваться в белые льняные рубашки.

Прыгожая – у нас красивые города, деревни, улицы, площади.

Працалюбівая – в Беларуси живут трудолюбивые люди, которые делают много необходимых вещей.

Лясная – много лесов, боров, пущ.

Масцеравая – в Беларуси очень много мастеров, которые вышивают, плетут из лозы, рисуют.

Шчодрая – белорусская земля очень щедра. Она дарит богатый урожай овощей и фруктов, ягод и грибов.

Талерантная – в Беларуси живут добрые люди. Они уважают других людей, считаются с их мнением. У них много друзей.

Партызанская – в годы Великой Отечественной войны в белорусских лесах было много партизанских отрядов, которые сражались за Родину.

**Настаўнік.** Цудоўная карціна атрымалася ў вас.

**<u>Мая Беларусь</u>**

1. Як правільна называецца дзяржава, у якой ты жывеш? ( Рэспубліка Беларусь)
2. Як называецца крэпасць, чкая першая прыняла ўжар у першыя дні вайны? (Брэсцкая)
3. Колькі абласцей у Беларусі? (6)
4. Якая рака працякае ў горадзе Гродна ( Нёман)
5. Назавіце дзень, калі святкуецца Дзень Незалежнасці Беларусі ( 3 ліпеня)
6. Які звер лічыцца сімвалам Белавежскай пушчы ( зубр)
7. Якімі словамі пачынаецца гімн Беларусі ( мы – беларусы. Мірныя людзі)
8. Гэта і беларускі танец і карняплод – сімвал Беларусі ( Бульба)

Н: Я спадзяюся, што кожны з вас паглыбіў свае веды аб нашай краіне. І пачынаючы з сённяшняга дня будзеце вучыцца і паводзіць сябе так, каб у будучым стаць сапраўднымі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь. Хачу, каб радкі, якія я вам зараз зачытаю, сталі вашым дэвізам:

“Жыві, шукай, усё рабі як след,

Каб на Радзіме твой свяціўся след”.

А цяпер я вам прапаную ў парах скласці сінквейн. Слова БЕЛАРУСЬ

Хлопчыкі і дзяўчынкі, а давайце мы разам з вамі падвядзем вынікі нашага мерапрыемства. (вучні чытаюць верш П.Броўкі)

Слаўлю я свой край любімы,
Незгасальную зару.
Як ты сэрцу майму міла,
Дарагая Беларусь!
Залацістыя прасторы,
Незлічона ясных зор,
Рэкі ціхія, азёры,
Галасісты шумны бор!
Ты нас ласкай атуліла,
І я ў шчасці гавару:
Як ты сэрцу майму міла,
Дарагая Беларусь!
Не магло мне і прысніцца,
Як ты, родная, ўзрасла.
Паглядзі, твая сталіца,
Быццам казка, расцвіла.

Наша радасць, наша сіла,
Дзе для ўдзякі слоў збяру?
Як ты сэрцу майму міла,
Дарагая Беларусь!